Тэма 6

# ГЕАГРАФІЯ ГАСПАДАРКІ І ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ БЕЛАРУСІ



## § 26. Галіновая і тэрытарыяльная структура нацыянальнай эканомікі

*Успомніце. На якія сектары падзяляецца сусветная эканоміка? Чаму краіны займаюцца рознымі відамі эканамічнай дзейнасці? На якім этапе развіцця знаходзіцца большасць развітых краін свету?*

**1. Нацыянальная эканоміка Беларусі.** Нацыянальная эканоміка любой краіны — гэта складаная гаспадарчая і сацыяльная сістэма. Яна мае галіновую і тэрытарыяльную структуру. Сучасная эканоміка Беларусі фарміравалася ў выніку працяглага гістарычнага развіцця ў адпаведнасці з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі тэрыторыі, асаблівасцямі дэмаграфічнага развіцця.

Асноўны эканамічны паказчык, які характарызуе нацыянальную эканоміку, — валавы ўнутраны прадукт (ВУП). ВУП Беларусі скараціўся ў 1991 г. у час эканамічнага крызісу, які перажывала краіна пасля распаду СССР. Пачынаючы з 2000 г. Беларусь выйшла на ўстойлівы рост гэтага паказчыка (мал. 88).

Што такое ВУП і як ён вызначаецца?

За 2015–2024 гг. ВУП Рэспублікі Беларусь павялічыўся ў 2,5 разу і склаў каля 246,6 млрд руб.

Галоўнымі паказчыкамі, якія вызначаюць узровень эканамічнага развіцця і якасць жыцця насельніцтва краіны, з'яўляюцца ВУП на душу насельніцтва і індэкс чалавечага развіцця (ІЧР). ВУП на душу насельніцтва ў 2024 г. складаў 27,0 тыс. руб. Больш высокі паказчык сярод краін СНД толькі ў Расіі і Казахстана. Па ІЧР Беларусь уваходзіць у групу краін з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця і займае 69-е месца сярод 193 краін.




Мал. 88. Дынаміка ВУП Рэспублікі Беларусь

Кожная краіна развівае сваю эканоміку па пэўнай мадэлі. Рэспубліка Беларусь у якасці мадэлі выкарыстоўвае сацыяльна арыентаваную рыначную эканоміку. Эканоміка Беларусі развіваецца па інавацыйным шляху: праводзіцца мадэрнізацыя вытворчых магутнасцей, укараняюцца найноўшыя тэхналогіі, ствараюцца тэхнапаркі, функцыянуе Парк высокіх тэхналогій.

**2. Сучасная структура эканомікі Беларусі.** У эканамічнай геаграфіі вылучаюцца галіновая і тэрытарыяльная структура гаспадаркі.

**Галіновая структура гаспадаркі** — гэта сукупнасць галін і відаў гаспадарчай дзейнасці краіны, якая характарызуецца іх колькаснымі суадносінамі і ўзаемасувязямі.

Фарміруецца галіновая структура гаспадаркі ў выніку грамадскага і тэрытарыяльнага падзелу працы. Найбольш уплываюць на яе прыродныя ўмовы і рэсурсы, патрэбы ўнутранага і знешняга рынкаў, навукова-тэхнічны прагрэс. Гаспадарчы комплекс краіны ахоплівае розныя галіны вытворчасці і віды эканамічнай дзейнасці.

Гаспадарка краіны падзяляецца на сферу вытворчасці і сферу паслуг, а яны, у сваю чаргу, на галіны і падгаліны. Злучальнымі элементамі галіны з'яўляюцца або аднатыпны тэхналагічны працэс, або аднастайнасць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадукцыі, паслуг, або агульнасць сыравіны. У сістэме кіравання эканомікай Беларусі галіновы прынцып захоўваецца, для статыстыкі выкарыстоўваецца агульнадзяржаўны класіфікатар «Віды эканамічнай дзейнасці» (форзац 2).

Рэспубліка Беларусь характарызуецца блізкімі паказчыкамі долі ВУП сферы вытворчасці і сферы паслуг. Пры гэтым доля сферы паслуг штогод павялічваецца. Цяпер на яе прыпадае 49,7 % ВУП, а на сферу вытворчасці — толькі 37,6 %, такім чынам, Беларусь набліжаецца да постіндустрыяльнай стадыі эканамічнага развіцця. Сферы вытворчасці і паслуг, у сваю чаргу, падзяляюцца на галіны з рознай доляй у ВУП (мал. 89).

Асновай вытворчага патэнцыялу Беларусі застаецца прамысловасць, на долю якой прыпадае каля 25 % аб'ёму ВУП. У адпаведнасці з класіфікацыяй відаў эканамічнай дзейнасці да іх адносяцца прадпрыемствы горназдабыўной і апрацоўчай прамысловасці. Да сферы вытворчасці таксама адносяцца прадпрыемствы, якія займаюцца вытворчасцю і забеспячэннем электраэнергіяй, газам і вадой, абыходжаннем з адходамі.

Важнымі складнікамі сферы вытворчасці Беларусі з'яўляюцца сельская, лясная і рыбная гаспадарка, на долю якой у апошнія гады прыпадае каля 7 % аб'ёму ВУП, а таксама будаўніцтва, доля якога ў структуры ВУП складае каля 6 %.

Сфера паслуг у галіновай структуры прадстаўлена вялікай колькасцю відаў эканамічнай дзейнасці. Іх умоўна можна аб'яднаць у тры групы:




Мал. 89. Структура ВУП Беларусі па відах эканамічнай дзейнасці, 2024 г., %

гандаль, дзелавыя і бытавыя паслугі; навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі; транспартная дзейнасць.

Фарміраванне тэрытарыяльнай структуры эканомікі залежыць ад фактараў размяшчэння галін вытворчасці і сферы паслуг.

**3. Фактары размяшчэння вытворчасці.** Размяшчэнне аб'ектаў сферы вытворчасці і сферы паслуг залежыць ад пэўных умоў (фактараў).

Энерга- і матэрыялаёмістыя галіны прамысловасці, сельскай гаспадаркі, некаторыя аб'екты сферы паслуг залежаць ад прыродна-рэсурснага патэнцыялу.

Беларусь характарызуецца спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для гаспадарчай дзейнасці: слабое расчляненне рэльефу спрыяе будаўніцтву дарог і гаспадарчых аб'ектаў; клімат — сельскагаспадарчай і рэкрэацыйнай дзейнасці; водазабяспечанасць — развіццю вадаёмістых вытворчасцей, стварэнню зон адпачынку. Якія яшчэ прыродныя ўмовы спрыяльна ўплываюць на развіццё эканомікі?

Размяшчэнне прадпрыемстваў залежыць ад сыравіннага (вытворчасць калійных угнаенняў, хімічных валокнаў) і паліўна-энергетычнага (металургія, вытворчасць штучных валокнаў) фактараў. У цяперашні час роля гэтых фактараў зніжаецца, узрастае залежнасць эканомікі ад фінансавых і інфармацыйных патокаў.

Эканоміка-геаграфічнае становішча (ЭГС) краіны і рэгіёнаў таксама ўплывае на размяшчэнне прадпрыемстваў. Важным з'яўляецца становішча рэгіёна адносна шляхоў зносін, патокаў сыравіны і энергіі, блізкасці да рынкаў збыту прадукцыі. У эпоху глабалізацыі значнасць ЭГС не страчваецца.

На размяшчэнне галін уплывае працоўнарэсурсны фактар. Размяшчэнне адных галін арыентуецца на колькасць працоўных рэсурсаў, а другіх — на іх якасць. Беларусь характарызуецца дастатковай колькасцю працоўных рэсурсаў, высокім узроўнем іх адукацыі і кваліфікацыі. Пра павышэнне значэння дадзенага фактару сведчыць развіццё навука- і працаёмістых галін.

Для многіх вытворчасцей тавараў і аказання паслуг галоўным выступае спажывецкі фактар. Асабліва вялікі ўплыў ён робіць на вытворчасць прадукцыі харчовай прамысловасці, развіццё сельскай гаспадаркі, гандаль, гасцінічную гаспадарку, грамадскае харчаванне і іншыя галіны сферы паслуг.

Чаму большае развіццё спажывецкі фактар атрымаў у гарадах?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Размяшчэнне многіх вытворчасцей Беларусі вызначаецца экалагічным фактарам. У цяперашні час яго значнасць павышаецца, паколькі рэалізуецца Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. (НСУР–2030).

Да фактараў размяшчэння гаспадаркі Беларусі адносіцца транспартна-інфраструктурны. Транспарт і сувязь памяншаюць значэнне спажывецкага фактару, паколькі зніжаюць залежнасць рэалізацыі прадукцыі ад адлегласці яе дастаўкі спажыўцу, а вытворчасці прадукцыі — ад сыравіннага фактару.

У эпоху НТР на размяшчэнне галін гаспадарчага комплексу павялічыўся ўплыў фактару развіцця навукі і тэхналогій. Многія прадпрыемствы арыентуюцца на Парк высокіх тэхналогій, навукова-даследчыя інстытуты НАН Беларусі.

Сярод фактараў размяшчэння гаспадаркі ў Беларусі варта адзначыць тэрытарыяльнае планаванне ў рамках дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі, якое прагназуе развіццё гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі краіны.

**4. Найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя цэнтры краіны.** Тэрытарыяльная структура эканомікі краіны адлюстроўвае ролю асобных рэгіёнаў у фарміраванні ВУП і іх спецыялізацыю. У рэгіянальным развіцці Беларусі назіраецца працэс тэрытарыяльнай канцэнтрацыі вытворчасці і насельніцтва ў Мінску. Адзначаецца больш хуткі рост буйных гарадоў, размешчаных у Мінскай агламерацыі і іншых рэгіянальных цэнтрах. Гарады характарызуюцца развіццём большай колькасці відаў эканамічнай дзейнасці.

На базе гарадоў фарміруюцца сацыяльна-эканамічныя цэнтры. Па аб'ёмах вытворчасці іх можна падзяліць на найбуйнейшыя (міжнародныя), буйныя (нацыянальныя), сярэднія (рэгіянальныя), малыя (субрэгіянальныя) і дробныя (мясцовыя). Найбольшае значэнне ў тэрытарыяльнай структуры ВУП адыгрываюць найбуйнейшыя (Мінск) і буйныя прамысловыя цэнтры. Мінск мае найбольш разгалінаваную структуру эканомікі з практычна ўсімі відамі эканамічнай дзейнасці.

Да катэгорыі буйных, або нацыянальных, прамысловых цэнтраў адносяцца 18 гарадоў Беларусі.

Знайдзіце на карце атласа (с. 38) міжнародныя і нацыянальныя прамысловыя цэнтры. Прааналізуйце структуру іх прамысловасці і растлумачце, чаму яны адносяцца да найважнейшых.

Буйныя прамысловыя цэнтры характарызуюцца як шматгаліновай прамысловасцю, так і развітой сферай паслуг. Яны выконваюць і адміністрацыйна-кіраўнічыя функцыі — як цэнтры адміністрацыйных

раёнаў. Выключэнне — некаторыя гарады абласнога падпарадкавання (Жодзіна і Наваполацк), якія з'яўляюцца буйнымі прамысловымі цэнтрамі, але не з'яўляюцца адміністрацыйнымі цэнтрамі раёнаў.

**Падвядзём вынікі.** Эканоміка Беларусі мае развітую галіновую і тэрытарыяльную структуру. ВУП краіны — 246,6 млрд руб., ВУП на душу насельніцтва — 27,0 тыс. руб. Гаспадарка Беларусі падзяляецца на сферу вытворчасці і сферу паслуг, з перавагай апошняй у структуры ВУП. Размяшчэнне галін гаспадаркі залежыць ад прыродна-рэсурснага патэнцыялу, эканоміка-геаграфічнага становішча, працоўных рэсурсаў, спажывецкага, экалагічнага, транспартнага, інфармацыйнага і іншых фактараў.

***Праверце сябе.*** 1. Як змяняецца ВУП краіны на сучасным этапе развіцця эканомікі? 2. Назавіце мадэль развіцця эканомікі Беларусі. 3. На якія сферы падзяляецца эканоміка Беларусі? 4. Якія ўмовы і фактары ўплываюць на размяшчэнне вытворчасці ў Беларусі? 5. Які прамысловы цэнтр адносіцца да найбуйнейшых па аб'ёмах вытворчасці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Пералічыце віды прамысловай прадукцыі, вытворчасць якой залежыць ад сыравіннага і паліўна-энергетычнага фактараў. 2. Растлумачце, якія галіны гаспадаркі арыентуюцца на спажыўца і чаму.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па дадзеных атласа і інтэрнэт-рэсурсаў падрыхтуйце паведамленне пра структуру валавога рэгіянальнага прадукту вашай вобласці.

## § 27. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Геаграфія раслінаводства

***Успомніце.*** *На якія падгаліны падзяляецца сельская гаспадарка? У чым асаблівасці агракліматычных рэсурсаў Беларусі?*

**1. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Сельская гаспадарка з'яўляецца важнай галіной эканомікі Рэспублікі Беларусь, якая забяспечвае харчовую бяспеку краіны. Асноўная задача сельскай гаспадаркі — задавальненне попыту насельніцтва на прадукты харчавання, а таксама забеспячэнне сыравінай прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці. Сельскагаспадарчая вытворчасць — асноўны від занятасці ў сельскай мясцовасці. На долю сельскай гаспадаркі ў Беларусі прыпадае 6,1 % ВУП, у ёй занята 7 % у спісачнай колькасці занятых у эканоміцы. Спецыялізуецца сельская гаспадарка на вытворчасці малака і мяса, збожжавых культур, бульбы, цукровых буракоў і лёну. Па аб'ёме вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі вылучаюцца Мінская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне